Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 230 (299)
ПЯТНІЦА 4 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР.

Задача далейшага расшырэння нашай прамысловасці патрабуе пастаяннага прытоку новай рабочай сілы на шахты, руднікі, транспарт, фабрыкі і заводы. Без бесперапыннага папаўнення састава рабочага класа немагчыма паспяховае развіццё нашай прамысловасці.

У нашай краіне поўнасцю знішчана беспрацоўе, назаўсёды пакончана з нішчатой і разбурэннем у вёсцы і горадзе, з прычыны гэтага ў нас няма такіх людзей, якія-б вымушаны былі стукацца і прасіцца на фабрыкі і заводы, стыхійна ўтвараючы, такім чынам, пастаянны рэзерв рабочай сілы для прамысловасці.

У гэтых умовах перад дзяржавай стаіць задача арганізаванай падрыхтоўкі новых рабочых з гарадской і калгаснай моладзі і стварэння неабходных працоўных рэзерваў для прамысловасці.

У мэтах стварэння дзяржаўных працоўных рэзерваў для прамысловасці Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР **пастанаўляе:**

1. Прызнаць неабходным штогодна падрыхтоўваць для перадачы ў прамысловасць дзяржаўныя працоўныя рэзервы ў колькасці ад 800 тысяч да 1 мільёна чалавек, шляхам навучання гарадской і калгаснай моладзі пэўным вытворчым прафесіям у Рамесніцкіх Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Навучання.

2. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых металістаў, металургаў, хімікаў, гарнякоў, нафтавікоў і рабочых іншых складаных прафесій, а таксама кваліфікаваных рабочых для марскога транспарта, рачнога транспарта і прадпрыемстваў сувязі—арганізаваць у гарадах Рамесніцкія Вучылішчы з двухгадовым тэрмінам навучання.

3. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых чыгуначнага транспарта—памочнікаў машыністаў, слесараў па рамонту паравозаў і вагонаў, кацельшчыкаў, брыгадзіраў па рамонту пуці і іншых рабочых складаных прафесій — арганізаваць Чыгуначныя Вучылішчы з двухгадовым тэрмінам навучання.

4. Для падрыхтоўкі рабочых масавых прафесій, у першую чаргу для вугальнай прамысловасці, горна-руднай прамысловасці, металургічнай прамысловасці, нафтавай прамысловасці, і для будаўнічай справы — арганізаваць школы Фабрычна - Заводскага Навучання з шасцімесячным тэрмінам навучання.

5. Устанавіць, што абучэнне ў Рамесніцкіх Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Навучання вытвараецца бясплатна і навучаючыяся ў перыяд навучання знаходзяцца на ўтрыманні дзяржавы.

6. Устанавіць, што дзяржаўныя рэзервы рабочай сілы знаходзяцца ў непасрэдным распараджэнні Совета Народных Камісараў СССР і не могуць быць выкарыстоўваемы наркаматамі і прадпрыемствамі без дазволу ўрада.

7. Прадаставіць права Совету Народных Камісараў СССР штогодна прызываць (мабілізоўваць) ад 800 тысяч да 1 мільёна чалавек гарадской і калгаснай моладзі мужчынскага полу ва ўзросце 14—15 год для навучання ў Рамесніцкіх і Чыгуначных Вучылішчах і ва ўзросце 16—17 год для навучання ў школах Фабрычна-Заводскага Навучання.

8. Абавязаць старшынь калгасаў штогодна выдзяляць у парадку прызыва (мабілізацыі) па 2 чалавекі моладзі мужчынскага полу ва ўзросце 14 — 15 год ў Рамесніцкія і Чыгуначныя Вучылішчы і 16—17 год у школы Фабрычна-Заводскага Навучання на кожныя 100 членаў калгасаў, лічачы мужчын і жанчын ва ўзросце ад 14 да 55 год.

9. Абавязаць Гарадскія Советы дэпутатаў працоўных штогодна выдзяляць у парадку прызыва (мабілізацыі) моладзь мужчынскага полу ва ўзросце 14 — 15 год у Рамесніцкія і Чыгуначныя Вучылішчы і 16—17 год у школы Фабрычна-Заводскага Навучання ў колькасці, штогодна ўстанаўляемай Советам Народных Камісараў СССР.

10. Устанавіць, што ўсе скончыўшыя Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання лічацца мабілізаванымі і абавязаны прапрацаваць 4 годы падрад на дзяржаўных прадпрыемствах, па ўказанню Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР, з забеспячэннем ім зарплаты па месцу работы на агульных падставах.

11. Устанавіць, што ўсе асобы, скончыўшыя Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання, карыстаюцца адтэрміноўкамі па прызыву ў Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот на час да сканчэння тэрміну, абавязковага для работы ў дзяржаўных прадпрыемствах, згодна артыкулу 10 гэтага Ўказа.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
2 кастрычніка 1940 года.

Аб утварэнні Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР.
ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і размеркаваннем дзяржаўных працоўных рэзерваў арганізаваць пры Совеце Народных Камісараў СССР Галоўнае Ўпраўленне Працоўных Рэзерваў.

2. У абласцях, краях і рэспубліках стварыць абласныя, краявыя, рэспубліканскія Ўпраўленні Працоўных Рэзерваў, а ў гарадах Маскве і Ленінградзе таксама і гарадскія Ўпраўленні Працоўных Рэзерваў з падначаленнем іх Галоўнаму Ўпраўленню Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР.

3. Ускласці на Галоўнае Ўпраўленне Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР:

а) падрыхтоўку дзяржаўных працоўных рэзерваў для прамысловасці і транспарта;

б) размеркаванне па рашэнню Соўнаркома СССР дзяржаўных працоўных рэзерваў, падрыхтаваных у Рамесніцкіх Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і школах Фабрычна-Заводскага Навучання.

4. Даручыць Галоўнаму Ўпраўленню Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР да 1 лістапада 1940 года ўнесці на зацвярджэнне Соўнаркома СССР:

а) план падрыхтоўкі працоўных рэзерваў па прафесіях;

б) праекты статутаў Рамесніцкіх Вучылішч, Чыгуначных Вучылішч і школ Фабрычна-Заводскага Навучання;

в) нормы выдаткаў на навучаючыхся ў Рамесніцкіх Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Навучання;

г) каштарыс выдаткаў на ўтрыманне Рамесніцкіх Вучылішч, Чыгуначных Вучылішч і школ Фабрычна-Заводскага Навучання на 1940—1941 гг.;

д) прапановы аб забеспячэнні навучаючыхся Рамесніцкіх Вучылішч, Чыгуначных Вучылішч і школ Фабрычна-Заводскага Навучання падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, інтэрнатамі, вопраткай, абуткам, бялізнай, пасцельнымі прыналежнасцямі і харчаваннем;

е) прапановы аб стаўках заработнай платы адміністратыўна-выкладчыцкаму персаналу Рамесніцкіх Вучылішч, Чыгуначных Вучылішч і школ Фабрычна-Заводскага Навучання.

5. Выключыць з ведання наркаматаў і ведамстваў і перадаць у месячны тэрмін з дня апублікавання данай Пастановы ў веданне Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР існуючыя школы Фабрычна-Заводскага Вучнёўства (за выключэннем дробных школ ФЗВ, а таксама школ ФЗВ, падрыхтоўваючых рабочых масавых прафесій тэкстыльнай, лёгкай і харчовай прамысловасці) па спісках, састаўленых Галоўным Упраўленнем Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР. Перадачу школ зрабіць па балансу на 1 жніўня 1940 года з вучэбна-вытворчымі памяшканнямі, абсталяваннем, інтэрнатамі, а таксама з наяўным саставам штатных выкладчыкаў і навучаючыхся.

6. Абавязаць наркаматы і дырэктараў прадпрыемстваў звярнуць Рамесніцкім Вучылішчам, Чыгуначным Вучылішчам і школам Фабрычна-Заводскага Навучання ўсе раней належаўшыя школам ФЗВ памяшканні, а таксама вызваліць памяшканні дзейнічаючых школ ФЗВ ад усіх іншых арганізацый і ўстаноў, за выключэннем некаторых тэхнікумаў па ўзгадненню з Галоўным Упраўленнем Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР.

7. Для пакрыцця выдаткаў па ўтрыманню і абсталяванню Рамесніцкіх Вучылішч, Чыгуначных Вучылішч і школ Фабрычна-Заводскага Навучання ў 1940 годзе адпусціць Галоўнаму Ўпраўленню Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР:

а) 100 мільёнаў рублёў з сродкаў наркаматаў і ведамстваў, асігнаваных на школы Фабрычна-Заводскага Вучнёўства і падрыхтоўку масавых прафесій;

б) 200 мільёнаў рублёў з бюджэта дзяржаўнага соцыяльнага страхавання 1940 года;

в) 300 мільёнаў рублёў з атрымоўваемых профсаюзамі адлічэнняў ад гаспадарчых арганізацый на культурна-масавую работу профарганізацый за час з верасня па снежань 1940 года;

г) 400 мільёнаў рублёў з рэзервавага фонда Соўнаркома СССР.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Упраўляючы Справамі Соўнаркома СССР М. ХЛОМАЎ.

Масква, Крэмль.
2 кастрычніка 1940 года.

Аб назначэнні тав. Маскатава П. Г. начальнікам Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР.
Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляе:**

Назначыць начальнікам Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР — тав. МАСКАТАВА П. Г.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Упраўляючы Справамі Соўнаркома СССР М. ХЛОМАЎ.

Масква, Крэмль. 2 кастрычніка 1940 г.

АБ ПРЫЗЫВЕ ГАРАДСКОЙ і КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ Ў РАМЕСНІЦКІЯ ВУЧЫЛІШЧЫ, ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ І ШКОЛЫ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКАГА НАВУЧАННЯ.
ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР» Совет Народных Камісараў СССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць Галоўнае Ўпраўленне Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР прыняць у перыяд з 10 па 25 лістапада 1940 года, як шляхам прызыва (мабілізацыі), так і шляхам адкрытага (добраахвотнага) набору, у Рамесніцкія Вучылішчы і Чыгуначныя Вучылішчы 350 тысяч чалавек і ў школы Фабрычна-Заводскага Навучання 250 тысяч чалавек з ліку гарадской і калгаснай моладзі мужчынскага полу ва ўзросце 14—15 год у Рамесніцкія і Чыгуначныя Вучылішчы і ва ўзросце 16—17 год у школы Фабрычна-Заводскага Навучання.

2. Абавязаць Галоўнае Ўпраўленне Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР да 10 кастрычніка 1940 года ўнесці на зацвярджэнне Соўнаркома СССР размеркаванне кантынгента прызываемых па кожнай області, краі, рэспубліцы ў Рамесніцкія Вучылішчы, у Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Навучання.

3. Абавязаць абласныя, краявыя выканкомы Советаў дэпутатаў працоўных і Соўнаркомы саюзных і аўтаномных рэспублік, зыходзячы з кантынгентаў прызыва па кожнай області, краі, рэспубліцы, устанавіць да 1 лістапада 1940 года колькасць гарадской і калгаснай моладзі, прызываемай у Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання па кожнаму гораду і адміністратыўнаму раёну, а выканкомы раённых Советаў дэпутатаў працоўных да 5 лістапада 1940 года размеркаваць колькасць прызываемых з ліку калгаснай моладзі па калгасах.

4. Устанавіць, што навучаючыяся, як мужчынскага, так і жаночага полу школ Фабрычна-Заводскага Вучнёўства, рэарганізуемых у Рамесніцкія і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Навучання, карыстаюцца пераважным правам прыёму ў Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Навучання.

5. Для правядзення прызыва гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання ўтварыць у гарадах і раённых цэнтрах камісіі ў саставе старшыні гарадскога, раённага выканаўчага камітэта Советаў дэпутатаў працоўных (старшыня камісіі), прадстаўніка профарганізацыі горада, раёна і сакратара гарадскога, раённага камітэта ВЛКСМ.

6. Усе асобы, прызываемыя (мабілізуемыя) у Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання, павінны прайсці медыцынскі агляд.

7. Кожнаму прызванаму камісія выдае на рукі пуцёўку ў Рамесніцкае Вучылішча, Чыгуначнае Вучылішча ці ў школу Фабрычна-Заводскага Навучання. Па форме, устаноўленай Галоўным Упраўленнем Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР, за подпісам старшыні камісіі і з пячаткай выканаўчага камітэта Совета дэпутатаў працоўных, а таксама літэр на права бясплатнага праезду па чыгунцы.

8. Абавязаць праўленні калгасаў забяспечыць прызываемых у Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання за кошт калгасаў верхняй вопраткай, абуткам, двума зменамі бялізны, прадуктамі харчавання на час следавання ў шляху да месца назначэння і прадастаўляць прызваным сродкі перасоўвання для праезду да чыгуначнай станцыі.

9. Абавязаць Народны Камісарыят Шляхоў Зносін, па заяўцы Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР, выдаць Галоўнаму Ўпраўленню Працоўных Рэзерваў неабходную колькасць літэраў і зрабіць перакідку асоб, прызываемых у Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання, да месца іх назначэння.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Упраўляючы Справамі Соўнаркома СССР М. ХЛОМАЎ.

Масква, Крэмль.
2 кастрычніка 1940 г.

У СОЎНАРКОМЕ СССР

Аб устанаўленні платнасці навучання ў старшых класах сярэдніх школ і ў вышэйшых навучальных установах СССР і аб змяненні парадку назначэння стыпендый.

Улічваючы ўзросшы ўзровень матэрыяльнага дабрабыту працоўных і значныя выдаткі Совецкай дзяржавы на будаўніцтва, абсталяванне і ўтрыманне бесперапынна ўзрастаючай сеткі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, Совет Народных Камісараў СССР прызнаў неабходным ускласці частку выдаткаў па абучэнню ў сярэдніх школах і ў вышэйшых навучальных установах СССР на саміх працоўных і ў сувязі з гэтым пастанавіў:

1. Увесці з 1 верасня 1940 года ў 8, 9 і 10 класах сярэдніх школ і ў вышэйшых навучальных установах плату за навучанне.

2. Устанавіць для навучаючыхся 8—10 класаў сярэдніх школ наступныя размеры платы за навучанне:

а) у школах Масквы і Ленінграда, а таксама сталічных гарадоў саюзных рэспублік — 200 рублёў у год;

б) ва ўсіх астатніх гарадах, а таксама ў сёлах — 150 рублёў у год.

УВАГА: Указаную плату за навучанне ў 8—10 класах сярэдніх школ распаўсюдзіць на навучаючыхся тэхнікумаў, педагагічных вучылішч, сельскагаспадарчых і медыцынскіх школ і іншых спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў.

3. Устанавіць наступныя размеры платы за навучанне ў вышэйшых навучальных установах СССР:

а) у вышэйшых навучальных установах, якія знаходзяцца ў Маскве, Ленінградзе і сталіцах саюзных рэспублік — 400 рублёў у год;

б) у вышэйшых навучальных установах, якія знаходзяцца ў іншых гарадах — 300 рублёў у год;

в) у вышэйшых навучальных установах мастацкіх, тэатральных і музыкальных — 500 рублёў у год.

4. Плата за навучанне ўносіцца ў адпаведныя навучальныя ўстановы роўнымі долямі два разы ў год: к 1 верасня і 1 лютага.

УВАГА: За першае поўгоддзе 1940—1941 навучальнага года плата за навучанне ўносіцца не пазней 1 лістапада г. г.

5. Плата за завочнае навучанне ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах узімаецца ў палавінным размеры.

6. Устанавіць, што з 1 лістапада 1940 года стыпендыі назначаюцца толькі тым студэнтам і навучаючымся ў тэхнікумах, якія праяўляюць выдатныя поспехі. (ТАСС).

„Аб комуністычным выхаванні працоўных“
Даклад тав. М. І. Калініна для партыйнага актыва г. Масквы.

2 кастрычніка ў зале пленумаў МК ВКП(б) сабраўся партыйны актыў горада Масквы—сакратары райкомаў і пярвічных партарганізацый, дакладчыкі, лектары, прапагандысты, агітатары—усяго звыш 800 чалавек.

З дакладам на тэму «Аб комуністычным выхаванні працоўных» выступіў цёпла сустрэты актывам тав. М. І. Калінін. Яго яркі, глыбоказмястоўны даклад быў выслухан з велізарнай увагай.

Даклад тав. М. І. Калініна трансліравалі па ўсіх раёнах г. Масквы і Маскоўскай області, дзе яго слухаў шматлікі партыйны актыў. (ТАСС).

—о—

Сесія акадэміі навук БССР у Беластоку

12—13 кастрычніка ў Беластоку склікаецца сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная гадавіне вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад панскага іга.

На пасяджэнні сесіі будуць запрошаны прадстаўнікі шырокіх мас працоўных Беластока. Яны праслухаюць рад цікавых дакладаў вучоных: акадэміка В. І. Пічэта на тэму «Беларускі народ у барацьбе за сваё вызваленне», акадэміка С. Я. Вальфсона — «Навука сталінскай эпохі», акадэміка Н. М. Нікольскага — «Навука і рэлігія».

З цікавымі дакладамі на сесіі выступяць прадстаўнікі прыродазнаўчых навук. Акадэмік Кедраў-Зіхман паведаміць аб асноўных дасягненнях у галіне хімізацыі соцыялістычнага земляробства СССР, акадэмік Жэрбак — аб важнейшых выніках селекцыйнай работы ў СССР, акадэмік Вейс — аб развіцці механізацыі сельскай гаспадаркі СССР.

Член-карэспандэнт Акадэміі навук тав. Чыжэўскі зробіць даклад на тэму «Вучэнне акадэміка Вільямса аб травапольнай сістэме земляробства». (БЕЛТА).

—«о»—

35 тэкстыльных машын новых канструкцый

КІЕЎ. Кіеўскі эксперыментальны завод Наркамата тэкстыльнай прамысловасці прыступіў да выпрабу новых станкоў і агрэгатаў. Завод нядаўна сканструіраваў і выпусціў першыя бабінажныя (перамотачныя) машыны для шоўку. Хуткасць перамоткі на гэтых машынах 600-800 метраў у мінуту—у два з лішнім разы больш, чым на прымяняемых зараз машынах. Выраблена таксама серыя новых трасцільна-круцільных ватэраў, таксама працуючых з павышанай хуткасцю.

У ліку новых асвайваемых заводам тэкстыльных машын—агрэгат бесперапыннага прадзення і круткі віскознага шоўку. Гэты агрэгат заменіць рад комплексных машын. У стадыі накладкі машына арыгінальнай канструкцыі для нашыўкі і вязкі бахрамы канструктара тав. Літвінчука. Гэта машына павінна замяніць працаёмкі ручны працэс.

Канструктарамі завода складзен праект аўтамата для вытворчасці пласцінчатых рэміз (дэталі ткацкага станка). Да гэтага часу такія дэталі выраблялiся з дроту, хутка зношваліся. Першы такі аўтамат будзе выпушчан у гэтым годзе.

У агульным з 55 тыпаў машын, выпускаемых у гэтым годзе заводам, 35 новых, упершыню асвайваемых у Совецкім Саюзе.

—о—

НОВЫЯ ГАЗЕТЫ

Для лепшага абслугоўвання работнікаў прамысловасці рад галіновых газет з 1 кастрычніка рэарганізуецца. Газета «Індустрыя» пачынае выходзіць пад назвай «Чорная металургія».

Пачынаюць выдавацца 8 новых газет: тры разы ў тыдзень будзе выходзіць «Вугальная прамысловасць» і штотыднёва — «Нафта», «Прамысловасць будматэрыялаў», «Электрапрамысловасць», «Тэкстыльная прамысловасць», «Мясная і Малочная прамысловасць», «Рыбная прамысловасць», «Папяровая прамысловасць». (ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Прыём новых членаў ВКП(б)—адказная задача партыйных арганізацый

Прыём у партыю новых членаў з'яўляецца адным з важнейшых пытанняў у рабоце кожнай партыйнай арганізацыі. За лік каго расці, каго адбіраць у партыю, як арганізаваць справу прыёму, — такія пытанні штодзённа павінны стаяць перад кожным кіраўніком партыйнай арганізацыі.

На працягу ўсёй гісторыі ВКП(б) Ленін і Сталін нязўтомна вялі барацьбу за ўмацаванне арганізацыйных прынцыпаў большэвіцкай партыі, вялі барацьбу за чыстату, маналітнасць і адзінства яе радоў. Вось чаму, на аснове вучэння Леніна і Сталіна, наша партыя заўсёды прымала і прымае ў свае рады лепшых з лепшых рабочых, сялян і інтэлігенцыі, здольных высока трымаць званне члена партыі Леніна — Сталіна.

Владзімір Ільіч Ленін указваў, што наша партыя — «адзіная ўрадавая партыя, якая клапоціцца не аб павелічэнні ліку членаў, а аб павышэнні іх якасці». Таварыш Сталін таксама вучыць, што партыя «моцна не толькі колькасцю членаў, але раней за ўсё іх якасцю». На XVIII з'ездзе партыі таварыш Сталін у сваім дакладзе паставіў перад партыяй і кожнай партарганізацыяй задачу: «...сістэматычна паляпшаць састаў партыі, падымаючы ўзровень свядомасці членаў партыі і прымаючы ў рады партыі ў парадку індывідуальнага адбору толькі праверaных і адданых справе комунізма таварышоў».

Наша беластоцкая гарадская партарганізацыя, створаная год таму назад, правяла значную работу ў справе прыёму новых членаў у партыю. За гэты час прынята ў партыю 105 чалавек, у тым ліку 68 у члены і 37 чалавек — кандыдатамі ў члены ВКП(б). Партыйная арганізацыя расла галоўным чынам за лік лепшых людзей, якія праявілі сябе на практычнай гаспадарчай, совецкай, грамадска-палітычнай і комсамольскай рабоце.

Кандыдатам у члены ВКП(б), напрыклад, прынят тав. П. Г. Храмоў — член ЛКСМБ з 1939 года. Бацька яго да 1917 года быў батраком, а пасля 1917 года —рабочы-чыгуначнік. Тав. Храмоў зараз паказвае ўзоры на практычнай рабоце і актыўна ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці. Прынят у члены ВКП(б) тав. Г. Д. Дунскі — член комсамола, паходзіць з рабочых, закончыў школу ФЗВ, працаваў слесарам, змазчыкам, памочнікам машыніста, а зараз працуе машыністам паравознага дэпо ст. Беласток. Прынят у партыю т. Мазін які працуе тэхнолагам трэста хлебапячэння. Ён з 1930 года знаходзіцца ў комсамоле, атрымаў вышэйшую асвету і зараз добра арганізаваў работу. Свае веды і вопыт перадае другім таварышам, сістэматычна працуе над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Можна прывесці яшчэ многа прыкладаў, якія гавораць аб тым, што ў партыю ідуць лепшыя людзі, адданыя справе комунізма.

Але нельга, аднак, сказаць, што ў нас з пытаннем прыёму ў партыю ўсё абстаіць добра. За пройдзены перыяд мы мелі цэлы рад фактаў, калі некаторыя партарганізацыі і іх кіраўнікі несур'ёзна, лёгкадумна адносіліся да гэтага важнейшага пытання, нарушалі ленінска-сталінскі прынцып індывідуальнага адбору ў партыю. У выніку такіх адносін некаторыя пярвічныя партарганізацыі прынялі ў партыю недастойных, няўстойлівых і непадрыхтаваных людзей.

Партарганізацыя 2-га тэкстыльнага камбіната, дзе сакратаром працуе тав. Дзенісава, прыняла ў члены партыі тав. П. Калі пытанне аб яго прыёме разбіралі на бюро гаркома, высветлілася, што партарганізацыя не вывучыла данага таварыша. Сакратар партарганізацыі на бюро гаркома нічога не магла сказаць як станоўчага, так і адмоўнага аб таварышу П.

Партарганізацыя гарадскога аддзела міліцыі на сваім сходзе прыняла ў члены партыі тав. М. На бюро гаркома выяснілася, што тав. М. за час прабывання ў кандыдатах над сабой не працаваў, у грамадскім жыцці не прымаў ніякага ўдзелу і нават не азнаёміўся са статутам партыі. Партарганізацыя стралковай аховы чыгункі прыняла ў кандыдаты партыі тав. К., які на бюро гаркома заявіў, што ён не жадаў уступіць у партыю, адчуваючы сябе непадрыхтаваным, але яго з'агітавалі.

Бюро гарадскога камітэта партыі адмовіла ў прыёме гэтых таварышоў і ўказала сакратарам пярвічных партарганізацый на непартыйныя адносіны з іх боку да прыёму ў партыю

За апошні час гарком партыі ўскрыў многа фактаў нарушэння статута партыі членамі ВКП(б), пры рэкамендацыі для ўступлення ў партыю. У партарганізацыі аблшатрэбсаюза член партыі тав. Гурэвіч даў рэкамендацыю для ўступлення з кандыдатаў у члены партыі тав. Сіроціну, хаця ён ведаў яго ўсяго 9 месяцаў. Сакратар партарганізацыі не праверыў правільнасці рэкамендацыі, і тав. Сіроцін быў прынят у члены ВКП(б). Факт няправільнасці рэкамендацыі быў ускрыт толькі ў гаркоме КП(б)Б. У партарганізацыі дзяржрэзерваў на партыйным сходзе пры прыёме ў партыю тав. В. высветлілася, што ўсе рэкамендацыі напісаны з парушэннем статута.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што многія комуністы да пытання выдачы рэкамендацый адносяцца несур'ёзна, а сакратары раду пярвічных партарганізацый не надаюць патрэбнага значэння гэтаму пытанню.

Адным з сур'ёзных недахопаў у нашай партарганізацыі з'яўляецца тое, што пярвічныя арганізацыі, прымаючы новых людзей у партыю, не праяўляюць сапраўдных большэвіцкіх клопатаў аб выхаванні новапрынятых таварышоў, не ўцягваюць іх у актыўнае партыйнае жыццё.

У статуце нашай партыі чотка сфармуліравана, што кандыдацкі стаж устанаўліваецца для таго, каб новапрынятыя ў кандыдаты партыі прайшоў школу большэвіцкага выхавання, азнаёміўся з праграмай, статутам і тактыкай партыі. Партыйная арганізацыя за перыяд прабывання ў кандыдатах таго ці іншага таварыша павінна ўсебакова праверыць яго на практычнай рабоце, дасканала вывучыць і высветліць усе асабістыя якасці кандыдата. Владзімір Ільіч Ленін, прыдаючы велізарнае значэнне кандыдацкаму стажу, патрабаваў, каб да кожнага кандыдата «строга прымяняць правілы, якія-б сапраўды рабілі стаж сур'ёзнейшым выпрабаваннем, а не пустой фармальнасцю».

На жаль, многія кіраўнікі пярвічных арганізацый не ўсвоілі яшчэ гэтага ленінска-сталінскага прынцыпа і нездавальняюча арганізавалі работу па выхаванню і праверцы кандыдатаў партыі. Пры прыёме з кандыдатаў у члены партыі вельмі часта не ўлічваецца прахаджэнне кандыдацкага стажа, не высвятляецца, як кандыдат працаваў і рыхтаваў сябе ў члены партыі.

У партарганізацыі абласнога ўпраўлення міліцыі налічваецца 35 кандыдатаў, у тым ліку 22 чалавекі з пратэрмінаваным кандыдацкім стажам. Некалькі месяцаў таму назад бюро гарадскога камітэта, слухаючы справаздачу сакратара гэтай пярвічнай арганізацыі аб рабоце з кандыдатамі, адзначыла цэлы рад сур'ёзных недахопаў. Зараз мы праверылі, як выконваецца гэтае рашэнне гаркома. Устаноўлена, што ніякага паляпшэння ў рабоце не адбылося. Большасць кандыдатаў партыйных даручэнняў не маюць і слаба ўдзельнічаюць у грамадска-палітычнай рабоце, многія з іх не вучацца і да апошняга часу не азнаёмлены з статутам і праграмай партыі.

Не лепш абстаіць справа па рабоце з кандыдатамі партыі ў арганізацыі тэкстыльнага трэста. Тут на вучоце састаяць 17 кандыдатаў. Не гледзячы на тое, што большасць кандыдатаў гэтай арганізацыі маюць сярэднюю і вышэйшую асвету, у грамадскім і партыйным жыцці многія ўдзельнічаюць слаба і не працуюць над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню. Кандыдат партыі з снежня 1939 года тав. З. ніякіх даручэнняў ад пярвічнай арганізацыі не атрымоўвае, вывучэннем гісторыі партыі зусім не займаецца. А кандыдат партыі тав. Е., які мае вышэйшую асвету, нават газеты чытае ад выпадку да выпадку. З 42 кандыдатаў у партарганізацыі абласнога ўпраўлення НКУС (народны камісарыят унутраных спраў) партыйныя даручэнні маюць толькі 8 чалавек. Не ўсе кандыдаты маюць партыйныя даручэнні ў партыйнай арганізацыі рэдакцыі газеты «Вольная праца».

Трэба адзначыць, што ў некаторых партарганізацыях несур'ёзна падыходзяць і да дачы партыйных даручэнняў кандыдатам. У партарганізацыі службы чыгункі партыйныя даручэнні часцей усяго носяць вытворчы характар. Кандыдат партыі тав. Навашын кіруе групай грамадскіх інспектараў па безапаснасці руху паяздоў. Многія кандыдаты гэтай арганізацыі зусім не маюць ніякіх даручэнняў. Сакратар партарганізацыі не цікавіцца работай з кандыдатамі, не сочыць за іх ростам. Кандыдаты партыі тт. Сыкол, Максіменка, Гарбуз на апошніх трох партыйных сходах не прысутнічалі, а сакратар партарганізацыі нават не высвятліў прычын іх адсутнасці.

Недахопы ў рабоце з кандыдатамі партыі павінны быць неадкладна ліквідаваны. Кожны сакратар партыйнай арганізацыі павінен асабіста і штодзённа працаваць з кандыдатамі партыі, уцягваючы іх у грамадска-палітычную і партыйную работу.

Рашэнне ЦК ВКП(б) аб недахопах у справе прыёму новых членаў партыі абавязвае нашу гарадскую партыйную арганізацыю, кожную пярвічную арганізацыю і ўсіх партыйных кіраўнікоў хутчэй ліквідаваць недахопы ў гэтым вежнейшым пытанні. У першую чаргу мы павінны рашуча палепшыць усю нашу партыйна-палітычную работу, падняць актыўнасць усіх членаў і кандыдатаў партыі і палепшыць справу ідэйна-палітычнага выхавання комуністаў.

Гістарычныя ўказанні таварыша Сталіна аб сістэматычным паляпшэнні і ўмацаванні радоў партыі на аснове павышэння свядомасці членаў партыі і правядзення індывідуальнага адбору пры прыёме ў партыю з'яўляюцца законам для кожнай арганізацыі. Гэта абавязвае нас няўтомна павышаць усе звенні партыйнай работы, змагацца за паляпшэнне радоў нашай большэвіцкай партыі, адбіраць у свае рады лепшых з лепшых, найбольш свядомых і адданых справе комунізма рабочых, сялян і інтэлігенцыю.

М. Тупіцын,
сакратар Беластоцкага гаркома КП(б)Б.



Сакратар заводскага камітэта ВКП(б) Чэлябінскага трактарнага завода імені Сталіна С. С. Барысаў тутарыць з кандыдатамі ў члены партыі, вывучаючымі 6-ы раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

На здымку: (злева направа) С. С. Барысаў, брыгадзір па змазцы цэха шасі П. А. Брындзін і начальнік дызельнага цэха інжынер Е. В. Мамантаў.

Фота Н. Мезенцава. Фота ТАСС.

НАРАДА ЗАГАДЧЫКАЎ АДДЗЕЛАЎ ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ

У абкоме партыі адбылася абласная нарада загадчыкаў аддзелаў прапаганды і агітацыі гаркомаў і райкомаў партыі. Прысутнічала 45 чалавек.

На нарадзе заслуханы даклады аб становішчы прапагандысцкай і агітацыйнай работы ў Беластоцкім, Ваўкавыскім і Цэханавецкім раёнах. Дакладчыкі тт. Доўгі, Волнікаў і Цэдрык адзначылі, што ў апошні час прапагандысцкая і агітацыйная работа некалькі палепшылася. Многія члены партыі, кандыдаты, комсамольцы і непартыйная інтэлігенцыя сур'ёзна вывучаюць гісторыю ВКП(б).

Але побач з гэтым маюцца вялікія недахопы. Дакладчыкі і выступаючыя ў спрэчках указалі, што некаторыя комуністы яшчэ вывучаюць першы-трэці раздзелы «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», асобныя зусім не вучацца. Старшыня Беластоцкага райвыканкома тав. Акуліч вывучае толькі першы раздзел. Слаба вядзецца палітычная агітацыя сярод працоўных. Агіткалектывы амаль разваліліся. Райком партыі неаднаразова выносіў рашэнні аб паляпшэнні прапагандысцкай і агітацыйнай работы, але гэтыя рашэнні не выкананы.

У Ваўкавыскім раёне з красавіка прачытана 16 лекцый па гісторыі партыі, 32 даклады на міжнародныя і іншыя тэмы. Дакладчык тав. Волнікаў указаў, што некаторыя кіруючыя работнікі раёна, як старшыня райвыканкома, упаўнаважаны наркамата загатовак не вучацца.

У Цэханавецкім раёне, як і ў іншых, не праводзіцца работа ў хатах-чытальнях. Адкрыта ўсяго толькі пяць хат-чытален, а трэба адкрыць дзевяць.

Тав. Навіцкая гаворыць аб прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце ў Гродне. У жніўні былі прачытаны платныя лекцыі па гісторыі Заходняй Беларусі і аб контррэволюцыйнай дзейнасці ППС. Лекцыі мелі вялікі поспех. Рад папулярных лекцый прачытана на прадпрыемствах для рабочых і служачых. Значная частка іх чыталася на польскай і яўрэйскай мовах.

Тав. Кіркаешта — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома партыі — указаў, што ў Беластоку каля 600 чалавек непартыйных інтэлігентаў самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Парткабінетам гаркома за апошнія месяцы арганізавана 65 лекцый, якія праслухала 12.400 чалавек. Праведзена 177 групавых і індывідуальных кансультацый.

Загадчык сектара аддзела прапаганды абкома партыі тав. Скварчэўскі ў выступленні спыніўся на пытаннях кіраўніцтва работай школ і палітыка-асветных устаноў. У некаторых раёнах мелі месца скажэнні нацыянальнай палітыкі партыі. Аддзелы прапаганды райкомаў несвоечасова рэагавалі на гэта. У школах вельмі слаба пастаўлена выхаваўчая работа з настаўнікамі і дзецьмі.

Работай палітыка-асветных устаноў райкомы партыі ў большасці не займаюцца. У 11 раёнах не скарыстаны сродкі на арганізацыю работы хат-чытален. У Сапоцкінскім раёне работнікаў палітыка-асветных устаноў падбіраў і назначаў на работу бухгалтар раёна. Райком партыі гэтым пытаннем не займаўся. У Ваўкавыску работнікі палітасветустаноў не зацверджаны райкомам партыі.

Тав. Мацюшын (палітаддзел Беластоцкай чыгункі) гаворыць аб лекцыйнай рабоце лектарскай групы пры палітаддзеле. Прачытана 372 лекцыі, якія праслухала 44 тысячы чалавек. Далей тав. Мацюшын гаворыць аб самастойнай вучобе комуністаў чыгункі. Намеснік начальніка чыгункі тав. Сакалінскі над сабой зусім не працуе, ён палітычна непісьменны, нават не можа назваць ні аднаго твора В. І. Леніна. Начальнік дэпо Маладзечна заявіў, што вучыцца будзе тады, калі закончыцца падрыхтоўка да зімы.

Палітаддзел з 5 па 12 кастрычніка праводзіць у партарганізацыях чыгункі сходы, прысвечаныя другой гадавіне з дня выхаду «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». На сходах будзе абмеркавана становішча прапагандысцкай і агітацыйнай работы.

На чыгунцы арганізавана 52 агіткалектывы. Агітатарамі працуе больш 800 чалавек. Вылучаюцца ў рабоце агітатары тт. Пятровіч (Ваўкавыск), Гінесін (Беласток) і іншыя.

Несур'ёзным было выступленне загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Лапскага райкома партыі тав. Акімава. Ён абвінавачваў за дрэннае становішча прапаганды і агітацыі сакратароў райкома партыі, іншых работнікаў, але не аддзел прапаганды.

Тав. Самойленка (Кольнаўскі раён) звяртае ўвагу ўдзельнікаў нарады на ўзмацненне работы з сакратарамі пярвічных партыйных арганізацый. Без гэтага нельга дабіцца сур'ёзнага паляпшэння прапагандысцкай і агітацыйнай работы.

Тав. Селіцкі спыняецца на рабоце гурткоў па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Гурткі ёсць у многіх раёнах. Аднак, працуюць яны выключна дрэнна. У гуртках нізавога звяна вывучаюць гісторыю партыі не па этапах, як рэкамендаваў ЦК ВКП(б), а кожны раздзел асобна.

У канцы работы нарады з прамовай выступіў сакратар абкома партыі тав. Сямёнаў. Ён указаў, што загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі Ваўкавыскага, Беластоцкага і Цэханавецкага райкомаў партыі ў дакладах не далі поўнай карціны становішча прапагандысцкай і агітацыйнай работы ў раёнах. Тав. Сямёнаў падрабязна спыніўся на задачах аддзелаў прапаганды і агітацыі райкомаў партыі.

П. Дудо.

НАРАДА РАБСЕЛЬКОРАЎ БЕЛЬСКАГА РАЁНА

Рэдакцыя бельскай раённай газеты «Чырвоная звязда» склікала шырокую нараду сваіх селькораў і рабкораў. На нараду з'явілася звыш 70 чалавек рабочых, чыгуначнікаў, калгаснікаў і старшынь сельскіх советаў, работнікаў райкома і райвыканкома.

Са змястоўнай прамовай выступіў старшыня райвыканкома тав. Русак, які ўказаў на тое, што газета яшчэ недастаткова мабілізуе працоўных на выкананне гаспадарчых і палітычных мерапрыемстваў партыі і ўрада. Бельскі раён адстае больш чым іншыя па хлебапастаўках. Газета ў гэтым напрамку праяўляе недастатковую аператыўнасць.

Рэдактар бельскай газеты тав. Казуноў расказаў на нарадзе аб тым, што газета мае ўжо 60 селькораў, якія рэгулярна пасылаюць свае заметкі і карэспандэнцыі. За 1940 год на яе старонках выступіла 150 чалавек.

— Але-ж,—як правільна адзначыў тав. Казуноў,—гэта зусім недастаткова. Газета яшчэ не звязалася з перадавымі людзьмі раёна. З яе старонак яшчэ не гавораць стаханаўцы, перадавыя калгаснікі, слабы ў ёй удзел сельскай інтэлігенцыі і, у першую чаргу, настаўнікаў.

— Я быў малапісьменным, забітым селянінам,—пачынае сваё выступленне селькор тав. Кірылюк. А зараз на працягу чатырох месяцаў я напісаў звыш 50 артыкулаў і заметак. Амаль усе яны былі змешчаны ў «Чырвонай звяздзе».

Тав. Кірылюк піша на самыя разнастайныя тэмы: аб соцыялістычным будаўніцтве ў вёсцы, аб недахопах у рабоце сельсоветаў, аб кулаках-сабатажніках, якія зрываюць хлебапастаўкі.

Сакратар партарганізацыі станцыі Бельск т. Усцін справядліва крытыкуе рэдакцыю за недастатковае прыцягненне да ўдзелу ў газеце рабочых палякаў і яўрэяў. Ён лічыць, што газета павінна больш асвятляць пытанні падрыхтоўкі да зімы.

Селькор тав. Гарлоўскі расказвае аб насценгазеце, якая выдаецца ў іх вёсцы. Ён просіць, каб рэдакцыя раённай газеты больш зацікавілася работай рэдкалегій вясковых насценных газет.

У спрэчках выступілі райпракурор тав. Гамаў, сакратар райкома партыі тав. Ястрэмскі і іншыя.

Нарада прайшла дзелавіта. Яе ўдзельнікі ўзялі на сябе абавязацельства стаць актыўнымі карэспандэнтамі раённай і абласной газет.

Рэдакцыя ў далейшым павінна замацаваць і пашырыць колькасць рабкораў і селькораў.

Каб стаць больш даходчывай, газета павінна больш, чым да гэтага часу, будаваць сваю работу на мясцовых фактах, у тым ліку фактах і з рэволюцыйнага мінулага Бельскага раёна.

С. Натансон.

НАША РАДЗІМА

Казахская ССР

Сярод шаснаццаці саюзных рэспублік Казахская ССР па сваёй вялічыне самая вялікая пасля РСФСР. З захада на ўсход — ад Волгі да Алтая — яна выцягнулася амаль на 3 тысячы кілометраў.

Большая частка гэтай абшырнай рэспублікі — сухая, бязводная стэп. На поўдні Казахстана глеба, штучна арашоная водамі горных рэк, дае выдатныя ўраджаі. У Казахстане нараджаюцца пшаніца, цукрэвая свекла, хлапчатнік, рыс, кенаф і іншыя.

У стэпах, на вялікіх пасбішчах, пасуцца мільёны галоў жывёлы, галоўным чынам авец. Казахстан дае краіне многа шэрсці, скуры, мяса і мясных прадуктаў.

Да Кастрычніцкай рэволюцыі казахскі народ быў да крайнасці прыгнечан царскімі чыноўнікамі, мясцовымі кулакамі (баямі) і князькамі (манапамі). Большая частка казахаў займалася жывёлагадоўляй. Вандроўнікі-жывёлаводы перасоўваліся па тэрыторыі Казахстана ўслед за сваёй жывёлай. Вясной пасбішчам у Казахстане служыць расцвітаючая на кароткі час пустыня ці стэп, летам — высокагорныя лугі, восенню — зноў стэп, а зімой—даліны рэк з іх лугамі.

Вандроўка жывёлы асталася і цяпер, але са стадам зараз ідуць толькі нямногалікія чабаны калгасаў і соўгасаў; насельніцтва-ж асела на зямлю, пабудавала ўпарадкаваныя пасёлкі, занялося земляробствам.

З пераходам на аседласць казах-вандроўнік становіцца культурным калгаснікам. Учарашнія вандроўнікі дабіліся на паліўных землях Казахстана сусветных рэкордаў ураджайнасці рысу, цукровых буракоў. Узамен мноства дробных гаспадарак вандроўнікаў створана звыш 7 тысяч калгасаў і 193 зерневых, жывёлаводчых, хлапковых і іншых соўгасаў.

Там, дзе некалі зямлю ўспахвалі прастой сахой, цяпер на палях соўгасаў і калгасаў апрацоўваюць глебу і ўбіраюць ураджай трактары, камбайны і іншыя сучасныя сельскагаспадарчыя машыны.

Казахстан выключна багат карыснымі выкапнямі. У яго нетрах знаходзіцца больш паловы ўсіх запасаў медзі Совецкага Саюза, звыш 60 процантаў свінца і больш 40 процантаў цынка. У цэнтры рэспублікі размешчан Карагандзінскі вугальны басейн. Па здабычы каменнага вугля Караганда стаіць на трэцім месцы пасля Данецкага (Украіна) і Кузнецкага (Сібір) вугальных басейнаў. На захадзе Казахстана, паміж рэкамі Уралам і Эмбай, знаходзяцца буйнейшыя нафтавыя запасы. Казахстан багат таксама золатам, фасфарытамі, волавам і іншымі каштоўнейшымі выкапнямі.

Да рэволюцыі гэтыя багацці выкарыстоўваліся ў вельмі малай ступені, і то галоўным чынам замежнымі капіталістамі. У годы сталінскіх пяцігодак у Казахстане пачалося будаўніцтва фабрык, заводаў, шахт, прыіскаў і іншых прадпрыемстваў.

Гэтае будаўніцтва сустрэлася з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Рэспубліка цярпела ад бездарожжа. Зараз тэрыторыя Казахстана абагацілася новымі чыгуначнымі магістралямі, якія прайшлі па стэпах, праз пустыні і горныя хрыбты. Першай з іх была Туркестана-Сібірская чыгунка, злучыўшая Сібір з Казахстанам і Сярэдняй Азіяй. Другая магістраль ідзе з Сібіры праз вугальную Караганду да возера Балхаш, на беразе якога пабудаван адзін з буйнейшых у краіне медзеплавільных камбінатаў. Ад гэтай дарогі працягнулася лінія да Джэзказгана, самага буйнага ў Саюзе месцанараджэння медзі, і да Магнітагорска (Урал), куды ідзе карагандзінскі вугаль. Чыгуначныя шляхі пракладзены і да нафтавых месцанараджэнняў Эмбы, да багатых месцанараджэнняў Алтая. За годы совецкай улады ў рэспубліцы пракладзена таксама многа тысяч кілометраў грунтавых і шасейных дарог.

Казахстан адчуваў вострую нястачу ў вадзе. Большэвікі перамагаюць і гэту цяжкасць. Па строгаму плану штучна арашаны цэлыя раёны, пабудаваны вадасховішчы, вадаправоды.

У рэспубліцы не было кваліфіцыраваных нацыянальных кадраў. Іх сталі рыхтаваць на вытворчасці, у школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах. Учарашні вандроўнік стаў шахцёрам, рабочым свінцовага завода, машыністам паравоза, інжынерам-геолагам, урачом педагогам.

На ранейшых пустырах, у стэпах узніклі прамысловыя гарады: Караганда, Карсакпай, Балхаш, Ачысай і іншыя.

Дарэволюцыйны Казахстан не меў тэатраў. Цяпер у рэспубліцы 26 тэатраў і свая філармонія. Небывалага росквіту дасягнула мастацтва казахскіх народных пяўцоў — акынаў, першым сярод якіх стаіць вядомы ўсяму Саюзу старэйшы і выдатны акын Джамбул, узнагароджаны ўрадам СССР трыма ордэнамі.

Сталіца Казахстана — горад Алма-Ата (у перакладзе на беларускую мову «Бацька яблыкаў») — адзін з прыгажэйшых гарадоў СССР. Ён размешчан у прадгор'і, сярод незлічоных яблыкавых садоў, на фоне велічных гор, пакрытых вечным снегам.

СТАХАНАУЦЫ — АКТЫВІСТЫ ПРОФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ

У профсаюзных работнікаў заходніх абласцей ды і ў нашым абкоме саюза існавала няправільная думка аб тым, што без платных работнікаў нельга існаваць.

За 8 месяцаў, якія прайшлі з часу выбараў фабрычных камітэтаў, лік платных работнікаў на нашых фабрыках дасягнуў 99 чалавек. На многіх прадпрыемствах за лік дзяржавы трымаліся старшыні фабкомаў, культработнікі, інструктары фізкультуры. Не дзіва, што львіная доля членскіх узносаў і сродкаў, адпускаемых на культработу, уходзіла на ўтрыманне платнага апарата.

На 25-й фабрыцы, дзе ў месяц збіралі толькі 440 рублёў членскіх узносаў, на ўтрыманне профработнікаў уходзіла 1.080 рублёў. На фабрыцы № 17 па плану трэба было сабраць у месяц 1.750 рублёў членскіх узносаў, план выконваўся толькі на 50 процантаў, а ўтрыманне апарата фабкома абыходзілася ў 1.540 рублёў.

У самым абкоме саюза становішча было не лепшае, чым на фабрыках. Усю работу выконвалі платныя работнікі—члены прэзідыума. Абраныя ў састаў пленума і прэзідыума таварышы з прадпрыемстваў да работы не былі прыцягнуты.

Год радаснага жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, прайшоўшыя выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР заклікалі да актыўнай грамадскай дзейнасці многіх людзей. Рабочыя нашых фабрык і камбінатаў адчулі сябе поўнымі гаспадарамі. Гэта сказалася на росце ліку стаханаўцаў, двухстаночнікаў і чатырохстаночнікаў.

Паказальна тое, што нашы лепшыя стаханаўцы, як правіла,—актыўныя грамадскія работнікі. Гэта наш залаты фонд.

На другім тонкасуконным камбінаце—адным з перадавых прадпрыемстваў горада—нямала такіх актывістаў, стаханаўцаў, сапраўдных майстраў соцыялістычнай працы.

40 год працуе на фабрыках ткач тав. Бірыла. З першых дзён пасля прыходу арміі-вызваліцельніцы тав. Бірыла пачынае працаваць па-стаханаўску, пераходзіць на абслугоўванне двух станкоў і на іх выконвае не менш 115—120 процантаў нормы.

На вытворчых нарадах і сходах рабочых тав. Бірыла звычайна выступае з раней падрыхтаванымі, прадуманымі прапановамі. Ён агітуе за расшырэнне радоў стаханаўцаў. Рабочыя любяць тав. Бірыла. Яго абралі профоргам. Не трацячы часу, ён арганізаваў школу перадачы стаханаўскага вопыту і сам ёю кіруе. Ён-жа—грамадскі інспектар працы. І гэту работу выконвае прыкладна.

Ткач тав. Вільчэўскі—адзін з лепшых стаханаўцаў камбіната. Ён спаборнічае з сваім зменшчыкам тав. Бірыла і дае выдатныя вытворчыя паказчыкі. Тав. Вільчэўскага абралі старшынёй цэхавага камітэта. Да сваіх абавязкаў ён адносіцца з вялікай свядомасцю. У яго цэхкоме заўсёды ёсць дзяжурны; профоргі і рабочыя навучыліся вырашаць усе пытанні ў сваім цэхавым камітэце; у фабком звяртаюцца толькі ў выпадку сапраўднай неабходнасці. Перадавы стаханавец-ткач тав. Вільчэўскі арганізаваў па прыкладу тав. Бірыла школу перадачы стаханаўскага вопыту. Тав. Фурман—старшыня цэхавага камітэта прадзільнага цэха—19 год правяла ля матальнай машыны. Першай тав. Фурман перайшла на абслугоўванне 24 матальных верацён замест 12 і на іх перавыконвае нормы.

Да прыходу Чырвонай Арміі тав. Фурман была зусім непісьменнай. Аднойчы яна прыйшла ў фабрычны камітэт і прапанавала арганізаваць групу работніц, жадаючых ліквідаваць сваю непісьменнасць. З ёй згадзіліся. І яна пачала працаваць. У яе групе на заняткі з'яўляюцца ўсе работніцы. З першых дзён работы старшынёй цэхавага камітэта тав. Фурман акружыла сябе актывам. У прадзільным цэху ўсе рабочыя і работніцы—члены профсаюза. Аўтарытэт старшыні цэхавага камітэта вельмі вялікі.

Выконваючы рашэнні X пленума ВЦСПС, мы арганізавалі рад камісій. У іх увайшлі вылучаныя фабкомамі актывісты. Старшынёй камісіі па заработнай плаце выбрана тав. Мірэр—лепшы старшыня фабкома з усіх 33 прадпрыемстваў. Яна мае вялікі вопыт падпольнай работы, за якую яе не раз саджалі ў турму; яе ведаюць і любяць рабочыя. У гэту камісію ўвайшло 6 членаў абласнога камітэта саюза, раней не прыцягнутых да работы. З ліку нізавых актывістаў у камісію па заработнай плаце ўвайшла тав. Мурарэцкая—адна з лепшых профоргаў.

Былы ткач тав. Пырко, вылучаны на работу ў абком саюза, кіруе камісіяй па ахове працы. У камісію ўваходзіць і тав. Ваўкавыскі—рабочы 29-й фабрыкі. У час забастоўкі на былой фабрыцы Бекера тав. Ваўкавыскі быў членам стачачнага камітэта.

Член фабкома 12-й фабрыкі стаханавец ткач тав. Размарын увайшоў у культкамісію. У камісію соцстраха вылучана тав. Марозава, актыўная работніца 24-й фабрыкі, і тав. Зарэмбская, штопалка-стаханаўка 3-га камбіната. Цікава, што ўсе людзі, выбраныя ў састаў камісій—гэта старыя кадравыя рабочыя-стаханаўцы, добра ведаючыя вытворчасць.

Усе камісіі склалі планы работы. У абкоме арганізавана дзяжурства ў вячэрні час. Па плану камісіі па заработнай плаце на другім камбінаце пачаўся агляд абсталявання. Пачалася ўзаемаправерка абавязацельстваў па спаборніцтву паміж прадпрыемствамі. Жыллёва-бытавая камісія, якую ўзначальвае стаханаўка, у мінулым удзельніца многіх забастовак, тав. Зеленкевіч, прынялася па-дзеласому за праверку работы прыгарадных гаспадарак і фабрычных сталовых.

Перад абласным камітэтам саюза і фабрычна-заводскімі камітэтамі рабочых профсаюза шарсцянай прамысловасці ў новых умовах стаяць вялікія задачы. І мы іх выканаем пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, з дапамогай прышоўшых да актыўнай дзейнасці новых профработнікаў, працуючых на вытворчасці.

А. Прыцкер,
старшыня беластоцкага абласнога камітэта рабочых шарсцянай прамысловасці.



На здымку: лепшыя стаханаўцы фабрыкі гумавага абутку «Ардаль» (г. Ліда). Злева направа: Х. Г. Кон, Я. К. Чэпуль, З. Р. Гельман, Ц. І. Ганчароўская і дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Б. Г. Казлоўская.
Фота Б. Вернера. Фотахроніка БелТА.

НАСУСТРАЧ XXIII ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Першыя двухстаночніцы - табачніцы

У дзень знамянальнай гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў беластоцкая табачная фабрыка ўступіла ў лік дзейнічаючых прадпрыемстваў. Калектыў табачнікаў працягвае сваю работу па асваенню новага абсталявання. Фабрыка атрымала новыя складаныя станкі, гільзавыя і набіўныя машыны. У набіўным цэху стаіць нядаўна атрыманая складаная машына, якая будзе друкаваць і адначасова выпрацоўваць каробкі для папярос.

Вялікае жаданне калектыва хутчэй асвоіць складаную тэхніку, узяць ад яе ўсё тое, што яна можа даць. Некаторыя работніцы дабіліся значных поспехаў. Параўнаўча нядаўна на фабрыку прышла маладая работніца тав. Клыс. Спачатку яна вучылася працаваць пад кіраўніцтвам вопытных табачнікаў, зараз ёй даверылі набіўную машыну, і тав. Клыс самастойна на ёй працуе. Добрых вынікаў дабілася маладая работніца тав. Гардон: у паасобныя дні яна выпускае 113 тысяч папярос, нармальная-ж магутнасць набіўной машыны—110 тысяч папярос за змену.

Сярод табачніц ужо ёсць першыя двухстаночніцы. Работніца набіўнога цэха тав. Цараўская першая стала абслугоўваць дзве машыны.

Рух за пераход на двухстаночнае абслугоўванне назіраецца і сярод работніц гільзавага цэха. Работніца Штучко з'явілася да начальніка цэха і заявіла: «Жадаю абслугоўваць дзве гільзавыя машыны». Яна папрасіла паставіць да яе ў зменшчыцы работніцу Рагоўскую. Жаданне было задаволена. Зменшчыцы Штучко і Рагоўская цяпер абслугоўваюць па дзве гільзавых машыны. На двухстаночнае абслугоўванне перайшлі работніцы тт. Юнгман і Маркоўская.

Вынікі сказваюцца. Калі ў мінулай дэкадзе табачная фабрыка выпускала кожны дзень 300 тысяч штук папярос, то цяпер яна выпускае звыш 1.300 тысяч штук.

На фабрыцы ідзе падрыхтоўка да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Слаўную гадавіну табачнікі імкнуцца сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Калектыў фабрыкі паставіў перад сабой адказную задачу — у найкарацейшы тэрмін асвоіць складаную тэхніку і даць совецкаму спажыўцу папяросы высокай якасці.

Да свята намячаецца выпусціць новы сорт высокаякасных папярос пад назвай «Беларускія».

І. Давыдаў.

Перадавая трактарная брыгада

Першая трактарная брыгада Івана Кушнікова трымае пяршынства на Граеўскай машынна-трактарнай станцыі. На 20 верасня брыгада выканала гадавы план трактарных работ на 120,6 процанта. Замест 900 гектараў па плану брыгада ўзарала 1.085,8 гектара.

Трактарыст гэтай брыгады Пікіфар Барысаў выканаў сваё заданне на 200 процантаў. Ён з'эканоміў 1.312 кілограмаў гаручага. Трактарыст Міхаіл Уцінаў узараў 227 гектараў, замест 150 гектараў па плану. Трактарыст Фёдар Бандарэнка ўзараў 192,9 гектара.

Граеўская МТС у цэлым на 20 верасня выканала гадавы план трактарных работ на 92 проценты.

Змагаемся за поўнае выкананне і перавыкананне свайго вытворчага задання да 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Н. Астапенка,
намеснік дырэктара МТС па палітчасці.

Абцасавая фабрыка перавыканала гадавы план

Калектыў беластоцкай абцасавай фабрыкі дабіўся выдатных паказчыкаў у сваёй рабоце. На 1 кастрычніка гадавая праграма выканана па 102 проценты. Валавая прадукцыя па нязменных цэнах 1926—1927 гг. выканана на 128 процантаў.

Выдрыцкі,
тэхнарук фабрыкі.

ТЭАТР

„Як гартавалася сталь“

(Гастролі тэатра юнага гледача БССР ў Беластоку)

Нікалай Остроўскі, аўтар рамана «Як гартавалася сталь», быў непасрэдным удзельнікам грамадзянскай вайны. Усё тое, аб чым ён расказвае ў рамане, адбывалася вакол яго і з ім. Павел Карчагін — гэта сам Остроўскі, які свае юнацкія годы аддаў барацьбе за лепшыя чалавечыя ідэалы, які на ўласных плячах вынес ўсе цяжкасці вайны. І таму іменна так жыццёва праўдзіва, па-чалавецку шчыра і глыбока выразіў ён на старонках рамана вогненны змест геранчных дзён грамадзянскай вайны.

Галоўны герой рамана Павел Карчагін — гэта тып маладога патрыёта-большэвіка, тып таго маладога пакалення, якое ўсе свае юныя мары і парывы, усё сваё жыццё аддавала ў афяру новаму соцыялістычнаму жыццю.

Міхаіл Юдзілевіч — інсцэніроўшчык рамана — захаваў усё лепшае і тыпічнае ў творы Остроўскага. Ён не імкнуўся да таго, каб багаты змест рамана выкласці ў фармальна-вытрыманай п'есе, якая мае завязку і развязку. Адлюстраванне такой эпохі патрабуе велізарнага эпічнага палатна, дзе можна ўмясціць такую багатую па зместу сапраўднасць. Інсцэніроўка так і пабудавана, таму тэма і ідэя рамана поўнасцю даходзяць да гледача.

Спектакль у пастаноўцы народнага артыста БССР ордэнаносца Міровіча зроблен з вялікім майстэрствам. Мноства карцін і здарэнняў з велізарнай хуткасцю праносяцца перад вачыма гледача, частая і хуткая змена дэкарацый, перанясенне дзеяння з аднаго месца ў другое па шырокіх прасторах Украіны даюць уражанне сапраўднай дынамікі і атмасферы грамадзянскай вайны. Гэта не перашкаджае юнаму гледачу глыбока адчуць у сэрцы яркія карціны і вобразы. Спектакль зачароўвае юнакоў паэзіяй і лірыкай велізарнасці здарэнняў.

Аднак, спектакль мае і адмоўныя стораны. Хуткі тэмп ігры патрабуе асаблівага ўмення пераджываць данае становішча. На сцэне-ж адчуваецца некаторая тарапліваець. Гэта ўжо не тое, што называецца тэмпам. У некаторых сцэнах моладзь напамінае лялькі: рэзкія жэсты, лішняя мімічная ігра, хуткасць рухаў баз унутранага апраўдання — ствараюць такое ўражанне.

Той страшэнны вораг, супроць якога змагаецца народ — паказан у форме карыкатуры. Юны гледач больш смяецца над петлюраўцамі, чым ненавідзіць іх.

Тэмай, якая аб'ядноўвае ўсе звенні спектакля, — гэта лёс галоўнага героя Паўла Карчагіна. Яна еднае вакол сябе ўсе сцэны, зацямняе недахопы і прыкоўвае ўвагу гледача.

Лёс Паўла, яго жыццё, мары, справы — правільна зразумеў мастак Кіпніс, які з поспехам справіўся з сваёй задачай.

З артыстаў трэба асабліва адзначыць выканаўцу галоўнай ролі Паўла Карчагіна—артыста Фрыдмана. Цяжкі шлях ад вобраза юнага Паўкі да палітычна спелага Карчагіна актор паказаў бліскуча. Тав. Фрыдман унутрана апраўдаў сваю знешнюю неадпаведнасць з вобразам Паўкі. Мару юнака — змагацца за працоўны народ, служыць яму, не шкадуючы сябе і свайго жыцця для гэтай благароднай справы—артыст пранёс праз увесь лёс героя ад неасвядомленай яшчэ ўлюбленасці ў рэвальвер, як сімвала барацьбы, да свядомай і глыбокай веры ў жыццё. Так выхоўваўся большэвік. Крышталёва чыстае і чэснае аблічча Паўла Карчагіна выклікае глыбокую любоў гледача. Дух патрыятызма, беззаветнай адданасці радзіме — вось што падкупляе ў вобразе героя п'есы.

Гэтай-жа ідэяй ахоплены ўсе камсамольцы, сябры Паўла. Валя (артыстка Гурвіч) стварыла запамінаючыйся вобраз спачатку наіўнай дзяўчыны, а затым камсамолкі, да канца адданай вялікай справе. Бліскуча сыграна ёю сцэна ў турме, калі яна смела ідзе на смерць з песняй на вуснах.

Рыта (артыстка Цімафеева) вельмі стрымана, скупа на тэатральныя прыёмы ігры. Гэта дапамагло ёй чула правесці сцэну з Паўлам у губкоме. Адчуваецца, што яна шчыра любіць Паўла і ніколі не пакіне ўжо яго аднаго.

Жухрай (артыст Чэмеляў) не падняўся ў выкананні да такога чалавека-большэвіка, які сваім абліччам цалкам захапіў Паўла. Вучань унутрана пераўзышоў свайго настаўніка. Жухраю не хапае страсці, унутранага кіпення. У асноўным-жа вобраз зроблен цэльным. Гэта тактычны, асцярожны і вытрыманы большэвік-падпольшчык, заўсёды вясёлы і бадзёры, не губляецца ў любой абстаноўцы.

У юнацкіх захапленнях Паўла вялікую ролю іграў вобраз Тоні Туманавай (артыстка Ротэр). З юнай, бясклопатнай і рамантычнай дзяўчыны-гімназісткі Тоня ператвараецца ў халодную даму, якой інтарэсы Паўла, яго ўнутранае гарэнне і радасць чужды і незразумелы.

З эпізадычных ролей зроблена ярка і красачна роль Івана Жаркага (артыст Матусевіч). Гэты актор мае выдатны сцэнічны тэмперамент.

Усе дробныя недахопы рэжысуры і выканаўцаў сціраюцца агульным гучаннем і гармоніяй усяго спектакля, які праўзглашае новую комуністычную мараль.

А. Вольскі.

АРТЫЛЕРЫЙСКАЯ СТРАЛЬБА ПРАЗ ЛА-МАНШ

У апошні час у замежным друку зноў паявіліся паведамленні аб артылерыйскай стральбе паміж батарэямі германскай дальнабойнай артылерыі, размешчанымі на французскім узбярэжжы Ла-Манша, і англійскай артылерыяй з паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі. Берлінскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадаў паведамленне аб тым, што германскія дальнабойныя гарматы, устаноўленыя на французскім узбярэжжы, быццам пачалі ўжо абстрэл Лондана.

У сувязі з мяркуемай спробай уварвання германскіх войск у Англію замежныя ваенныя аглядальнікі надаюць сур'ёзнае значэнне артылерыйскай дзейнасці ў раёне Ла-Манша.

Мяркуючы па некаторых паведамленнях, англічане ставяць перад сваёй дальнабойнай артылерыяй такія задачы: падавіць германскія цяжкія батарэі, разбурыць порты магчымай канцэнтрацыі дэсантных войск праціўніка, а ў выпадку, калі дэсантныя аперацыі ўсё-ж пачнуцца, граміць транспарты праціўніка і флот, які іх ахоўвае.

Не менш надзеі, відаць, ускладае на сваю артылерыю і германскае камандаванне: дальнабойныя гарматы з французскага ўзбярэжжа могуць нанесці вялікія страты англійскім берагавым батарэям. Яны могуць трымаць пад абстрэлам водную паверхню Па-дэ-Кале і значнай часткі Ла-Манша на выпадак процідэсантных дзеянняў англійскага флота, зрабіць артылерыйскую падрыхтоўку высадкі дэсанта і ў далейшым агнём садзейнічаць першапачатковым дзеянням дэсанта па авалоданню ўзбярэжжам.

У сувязі з гэтым цікава ўспомніць гісторыю стральбы на вялікія дыстанцыі. Да першай імперыялістычнай вайны такая стральба не практыкавалася. Французскі генерал артылерыі Гаскуэн у сваёй працы «Эвалюцыя артылерыі ў час сусветнай вайны», ацэньваючы панаваўшыя да вайны 1914—1918 гг. погляды, пісаў, што артылерыйская стральба на адлегласці звыш 4—5 кілометраў лічылася немагчымай і ў некаторых арміях была забаронена статутамі. Аднак вопыт першых-жа год вайны 1914—1918 гг. паказаў, што неабходна ствараць дальнабойную артылерыю. Ваюючыя стораны пачалі тэрмінова канструіраваць дальнабойныя і звышдальнабойныя гарматы.

Ужо ў 1917 годзе немцы з новых гармат абстрэльвалі важныя стратэгічныя пункты Англіі (Сант-Омер, Дуленс), адстаячыя ад артылерыйскіх агнявых пазіцый на 62 кілометры. Пасля гэтага немцы рашылі сканструіраваць гармату для стральбы на дыстанцыі звыш 100 кілометраў. Заказ на пабудову такіх гармат выконваў артылерыйскі завод Крупа.

Для выпрацоўкі цела дальнабойнай гарматы была ўзята 380-міліметравая марская гармата. У яе была ўстаўлена 210-міліметравая стальная труба даўжынёй у 35 метраў. Снарад для гарматы важыў 125 кілограмаў. Для выстралу патрабаваўся зарад вагой у 200 кілограмаў. Пачатковая хуткасць снарада складала 1.500 метраў у секунду. Для ўстаноўкі так называемай гарматы «Каласаль», важыўшай 750 тон, каля 9 месяцаў будавалі спецыяльную пляцоўку.

У сакавіку 1918 года тры такіх гарматы былі ўстаноўлены ў ваколіцах Ліона (у 120 кіlометрах ад Парыжа).

23 сакавіка 1918 года ў 7 гадзін 15 мінут раніцы адна з гэтых велізарных гармат выпусціла першы снарад, які праз тры мінуты ўпаў на набярэжнай Сены ў Парыжы. Праз 15 мінут на вуліцы Карла V разарваўся другі снарад. І так праз кожныя 15 мінут у розных пунктах Парыжа разрываўся снарад за снарадам.

Першыя ўжо ўзрывы прывялі насельніцтва Парыжа ў паніку. Жыццё ў горадзе спынілася. Нават метрапалітэн спыніў сваю работу. За некалькі дзён каля мільёна парыжан пакінула горад. Немцы абстрэльвалі Парыж 44 дні. З выпушчаных 303 снарадаў у межах горада ўпалі 183. Рэзультат бамбардыроўкі — 250 забітых і 630 раненых.

Пасля скончэння сусветнай вайны да будаўніцтва гармат, якія страляюць на 120—130 кілометраў, прыступілі і іншыя краіны — Францыя, Англія, Італія, Амерыка. Пад стварэннем звышдальнабойных гармат і зараз працуюць ва ўсіх капіталістычных краінах. Не так даўно газета «Франс мілітэр» паведаміла, што ў Германіі канструіруецца новая звышдальнабойная гармата тыпу «Каласаль», прадназначаная спецыяльна для абстрэлу Лондана. Калібр гэтай гарматы 280 міліметраў, вага снарада 300 кілограмаў.

Некаторыя даныя, якія паяўляюцца ў замежным друку, паказваюць, што немцы абстрэльваюць англійскае ўзбярэжжа (Дуўрскі порт) з гармат калібрам у 305 мм. Паводле паведамлення газеты «Джорнале д'Італіа», уздоўж узбярэжжа Ла-Манша ўстаноўлены гарматы калібрам ад 420 да 510 мм. Мяркуючы па калібру, гэтыя гарматы павінны валодаць велізарнай прабіўной і разбураючай сілай. Так, напрыклад, пры асадзе бельгійскай крэпасці Намюр у 1914 годзе адзін з снарадаў гармат падобнага калібра трапіў у браніраваную вежу форта, прабіў стальны купал вежы і бетоннае перакрыцце таўшчынёй у 3 метры, а яго разрыў знішчыў амаль увесь гарнізон форта.

Абстрэл англійскага ўзбярэжжа (берагавых умацаванняў, докаў, портаў і іншых збудаванняў) германскай цяжкай артылерыяй, якая стаіць на лініі Кале-Булонь, можа быць надзвычайна эфектыўным, калі немцы змогуць наладзіць добры і безадмоўны паветраны нагляд за рэзультатамі стральбы і яе карэктыроўку.

Велізарная дальнабойнасць асобных узораў звышдальняй сучаснай артылерыі дае магчымасць немцам абстрэльваць усходняе і паўднёва-ўсходняе ўзбярэжжа Англіі і нават Лондан з раёна Кале. З другой стараны, пункты ўстаноўкі германскіх дальнабойных гармат і партовыя базы на французскім узбярэжжы, якія могуць быць выкарыстаны для канцэнтрацый германскіх дэсантных войск, таксама знаходзяцца пад непасрэднай пагрозай разбурэння англійскай берагавой артылерыяй.

Адлегласць ад пунктаў на ўзбярэжжы Францыі, дзе можна ўстанавіць звышдальнабойную артылерыю, да важнейшых прамысловых баз паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі такое:

Кале—Дуўр — 40 кілометраў.

Кале—Іпсвіч — 120 кілометраў.

Шэрбург—Портсмут — 150 кілометраў.

Кале—Лондан — 150 кілометраў.

Вопыт сусветнай вайны і ўзросшыя баявыя ўласцівасці сучаснай дальнабойнай артылерыі паказваюць, што пункты, прыведзеныя ў табліцы, цалкам дасягаемы для агня сучасных звышдальнабойных гармат. Які размах прыме ў далейшым артылерыйская дуэль праз Ла-Манш, пакажа будучыня. Трэба, аднак, памятаць, што поспех можа быць дасягнут толькі аб'яднанымі дзеяннямі марскога флота, авіяцыі, артылерыі і дэсантных войск.

Капітан **Н. Паўленка.**

ЗА РУБЯЖОМ

ЗВОДКА ГЕРМАНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

БЕРЛІН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступную зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

«Германская авіяцыя 1 кастрычніка і ў ноч на 2 кастрычніка зноў атакавала шматлікія і важныя ў ваенных адносінах аб'екты Лондана, а таксама Паўднёвай і Сярэдняй Англіі. Можна было наглядаць успыхнуўшыя пажары і ўзрывы. Злучэнне германскай авіяцыі з брыючага палёту бамбардыравала аэрапорт Пемброк-Кер'ю. У выніку бамбардыроўкі цяжка пацярпелі ангары. Некалькі непрыяцельскіх самалётаў было знішчана на зямлі. Германскія самалёты без страт звярнуліся на сваю базу.

Другія злучэнні авіяцыі зрабілі налёт на партовыя збудаванні Ліверпуля і прамысловыя прадпрыемствы Манчэстэра. Скінутыя бомбы выклікалі вялікія пажары і ўзрывы. Асобныя самалёты зрабілі налёт на ваенны завод, размешчаны на поўнач ад Лондана, а таксама на паблізу ляжачы начны аэрапорт. Адзначаны прамыя пападанні бомб цяжкага калібра.

Удзень ні адзін англійскі самалёт не паказаўся ні над тэрыторыяй самой Германіі, ні над занятымі абласцямі. Ноччу некалькі непрыяцельскіх самалётаў бамбардыравалі рад гарадоў Заходняй Германіі. Многа дамоў ахоплена пажарам. Некалькі англійскіх бамбардыроўшчыкаў спрабавалі наблізіцца да сталіцы Германіі з поўначы, але былі адагнаны агнём зенітнай артылерыі. На ўсход ад Берліна англійскім самалётам удалося скінуць бомбы. Будынкі не пацярпелі. Афяр няма.

Страты непрыяцеля за ўчарашні дзень склалі 17 самалётаў. Два германскіх самалёты не вярнуліся на сваю базу. Непрыяцель, асабліва ў апошні час, нясе значныя страты ў выніку дзеянняў германскай абароны».

Налёты на Лондан

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (ТАСС). 30 верасня ўвечары ўпершыню за два тыдні ў цэнтральным раёне Лондана было спакойна. Асобныя германскія самалёты спрабавалі наблізіцца з усіх бакоў да Лондана з тым, каб злучыцца над цэнтрам сталіцы. Аднак загараджальны агонь і патрулірующыя англійскія самалёты перашкодзілі ажыццявіць гэты план. Паўночна-ўсходняе прадмесце Лондана ноччу 30 верасня падвергласа жорсткай бамбардыроўцы.

БЕРЛІН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення Германскага інфармацыйнага бюро, сёння раніцай магутныя злучэнні гарманскай авіяцыі зрабілі новыя налёты на Англію. Начная трывога ў Лондане спынілася толькі спазаранку, але ўслед за гэтым была аб'яўлена новая паветраная трывога.

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Газета «Дэйлі экспрэс» піша, што за апошнія тыдні значна ўзрасла эфектыўнасць аэрастатаў паветранай загароды над Лонданам. Знаходзячыся на вялікай вышыні, яны перашкаджаюць бамбардыроўцы з пікіравання.

ЛОНДАН, 2 кастрычніка (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, міністэрства харчовага снабжэння мае намер скарыстаць шматлікія лонданскія кафэ для абслугоўвання насельніцтва раёнаў Лондана, пацярпеўшых ад бамбардыровак. Міністр харчовага снабжэння Вултон звярнуўся з заклікам да ўладальнікаў кафэ, якія пакінулі Лондан, зноў адкрыць свае ўстановы. Вултон паведаміў, што ў пацярпеўшых ад бамбардыровак раёнах Лондана створана 58 спажывецкіх пунктаў.

АФЯРЫ БАМБАРДЫРОВАК У ЛОНДАНЕ

НЬЮ-ЙОРК, 2 кастрычніка. (ТАСС). Лонданскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што, згодна неафіцыяльных звестак, у выніку паветраных налётаў на Лондан у верасні ёсць 5 тысяч забітых і 8 тысяч раненых.

Эвакуацыя жанчын і дзяцей

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійскі міністр аховы здароўя Макдональд заявіў, што жанчыны і дзеці 14 раёнаў Лондана будуць эвакуіраваны ў глыбіню краіны. У бліжэйшыя некалькі дзён эвакуіраваныя будуць адпраўлены ў сельскія мясцовасці, дзе ўжо расквартыравана 10 тысяч жанчын і дзяцей.

Англійскі друк аб дзеяннях англійскай авіяцыі

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Ньюс кронікл» паведамляе з Дуўра, што англійская авіяцыя 30 верасня і ў ноч на 1 кастрычніка зноў праяўляла ўзмоцненую актыўнасць у раёне портаў французскага ўзбярэжжа Ла-Манша, знаходзячыхся пад германскім кантролем.

Па думцы наглядальнікаў, якія знаходзяцца ў раёне Дуўра, англійская авіяцыя сваімі дзеяннямі на працягу апошніх двух тыдняў прадухіліла спробу германскага ўтаржэння ў Англію. Дакладных звестак, колькі германскіх суднаў і барж было патоплена ў выніку дзейнічання англійскай авіяцыі, у цяперашні час няма. Аднак, згодна агульнай думцы наглядальнікаў, у розных французскіх портах, размешчаных па ўзбярэжжы Ла-Манша, было пушчана да дна некалькі сот непрыяцельскіх суднаў.

Дуўрскі карэспандэнт газеты «Дэйлі экспрэс» піша, што, як стала вядома, сярод германскіх гармат, устаноўленых на французскім узбярэжжы, маюцца 11-дзюймовыя гарматы, дастаўленыя немцамі з лініі Мажыно.

Прабыванне Суньера ў Рыме

БЕРЛІН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Рыма, што ўчора ўвечары італьянскі міністр замежных спраў Чыана наладзіў прыём у чесць знаходзячагася ў Рыме іспанскага міністра ўнутраных спраў Серана Суньера.

Страты французаў

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (ТАСС). Ва Францыі лічаць, што ў вайне з Германіяй было забіта 100.000 французскіх салдат. Апрача таго, 2.000.000 французаў знаходзіцца ў Германіі ў палоне. Гэтым і тлумачыцца моцны недахоп кваліфікаваных рабочых ва Францыі.

—o—

ПРЫЁМ РУЗВЕЛЬТАМ ГРУПЫ НАЧАЛЬНІКАЎ ГЕНЕРАЛЬНЫХ ШТАБАЎ ЛАЦІНА-АМЕРЫКАНСКІХ КРАІН

НЬЮ-ЙОРК, 2 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, Рузвельт прыняў групу начальнікаў генеральных штабаў Лаціна-амерыканскіх краін, якая прыбыла ў ЗША па запрашэнню начальніка штаба амерыканскай арміі генерала Маршала. У сваім выступленні Рузвельт указаў, што абарона амерыканскага кантынента прадстаўляе сабой «агульную праблему».

Сярод прысутнічаючых на прыёме былі прадстаўнікі Балівіі, Калумбіі, Кастарыкі, Дамініканскай рэспублікі, Гватэмалы, Гондураса, Панамы, Перу і Уругвая. 2 кастрычніка прадстаўнікі гэтых краін вылятаюць на самалёце па спецыяльнаму маршруту працягласцю ў 8 тысяч міль. Яны азнаёмяцца з амерыканскай арміяй і яе базамі. Паездка закончыцца 17 кастрычніка ў зоне Панамскага канала.

16 кастрычніка ў ЗША прыбудзе другая група ваенных прадстаўнікоў краін Лацінскай Амерыкі, якія зробяць аналагічную паездку.

—o—

Заява Уілкі

НЬЮ-ЙОРК, 2 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт газеты «Крысчэн Сайэнс Манітор» у інтэрв'ю, даным яму кандыдатам рэспубліканскай партыі на пост прэзідэнта Уілкі, апошні заявіў, што ён з'яўляецца староннікам англа-амерыканскага пагаднення аб прадастаўленні амерыканскаму флоту ваенна-марскіх і авіяцыйных баз у Сінгапуры і Аўстраліі. Па славах карэспандэнта гэтай газеты, Уілкі адзначыў, што, па яго думцы, «інтарэсы ЗША і Англіі на Далёкім Усходзе паралельныя».

—o—

ПАТРАБАВАННЕ СКЛІКАННЯ НАДЗВЫЧАЙНАЙ СЕСІІ ЯПОНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

ТОКІО, 2 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Кокумін», група членаў ніжняй палаты японскага парламента, узначальваемая міністрам чыгунак Огава, міністрам калоній Акіта і міністрам аховы здароўя Канеміцу, настойвае на скліканні надзвычайнай сесіі парламента ў сувязі з заключэннем дагавора трох дзяржаў. Гэта група настайвае таксама на неабходнасці абмеркаваць на сесіі парламента пытанне аб рэформе выбарчага закона.

* * *

ТОКІО, 2 кастрычніка. (ТАСС). Газета «Ніці-ніці» паведамляе, што планавае бюро пры кабінеце рашыла перагледзець закон аб «мабілізацыі», бо ў тэты час ён аказаўся неэфектыўным. Закон будзе перагледжан пад вуглом погляду «мабілізацыі ўсяго насельніцтва на выкананне задач дзяржавы з тым, каб справіцца з ваеннай абстаноўкай». Пакаранні за парушэнне закона будуць больш цяжкімі, чым раней.

Прызыўнік Нікалай Дземідовіч

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У верасні мінулага года гераічная Чырвоная Армія перайшла граніцу былой Польшчы, каб вызваліць сваіх адзінакроўных братоў ад панскага гнёту.

Пачуўшы аб набліжэнні чырвонаармейцаў, юнакі мястэчка Азерніца, узброіўшыся чым папала, выйшлі на дапамогу байцам дабіваць сваіх адвечных прыгнятальнікаў. Яны дапамагалі выкрываць пераапранутых афіцэраў.

Нікалай Дземідовіч з групай сваіх таварышоў стаў на ахову маста, што недалёка ад мястэчка. Уцякаючы, абшарнікі спрабавалі ўзарваць мост, але баявая дружына юнакоў адбіла спробу ворагаў. Чырвонаармейскія часці бесперашкодна ўступілі ў мястэчка.

Тав. Дземідовіч пайшоў з байцамі і разам з імі прыбыў у Гродна. Тут ён паступіў у кравецкую майстэрню спецгандлю, дзе і працуе да апошняга часу.

Нядаўна ў жыцці Нікалая Дземідовіча адбыліся дзве вялікія радасныя падзеі. Яго, як лепшага стаханаўца, камсамольская арганізацыя прыняла ў свае рады. І другое, — ён атрымаў павестку з'явіцца ў прызыўную камісію.

Стаць байцом доблеснай Чырвонай Арміі — была заветная думка тав. Дземідовіча з таго часу, як ён упершыню сустрэўся з чырвонаармейцамі.

У дзень прызыву тав. Дземідовіч прачнуўся яшчэ надосвітку. Неспакойна спаў ён у гэту ноч. Апрануўшы чыстую кашулю і свой святочны касцюм, ён паспяшыў на прызыўны пункт.

Нікалай адчуваў сябе фізічна моцным, але ўсё-ж непакоіўся:

— А што, калі будзе якая-небудзь замінка — і яму скажуць: «Не годзен»!

Гэта думка яго надта трывожыла.

Тав. Дземідовіч — каля стала прызыўной камісіі. Сэрца яго забілася мацней і часцей. Азнаёміўшыся са справай прызыўніка і выслухаўшы яго адказы на пытанні, старшыня камісіі заявіў:

— Вы, таварыш Дземідовіч, прызваны ў рады Чырвонай Арміі і залічаны ў вайсковую школу. Будзеце вучыцца на чырвонага камандзіра.

Радасць ахапіла Дземідовіча. Ён заявіў:

—Вялікае дзякуй партыі і маёй дарагой радзіме за такое давер'е! Запэўніваю вас, таварышы, што з чэсцю апраўдаю званне чырвонага воіна.

Г. Лупсякоў.

—«о»—

Студэнты Беластоцкага музыкальнага вучылішча перад мікрафонам

Днямі адбыўся канцэрт студэнтаў Беластоцкага музыкальнага вучылішча. Канцэрт трансліраваўся радыёстанцыяй імені Комінтэрна.

Прайшло толькі 9 месяцаў з таго часу, калі ў Беластоку была адкрыта дзяржаўная музыкальная школа. Услед за тэтым пачало працаваць таксама музыкальнае вучылішча. У гэтых музыкальных вучэбных установах займаюцца дзеці рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, якія раней не мелі магчымасці вучыцца музыцы, бо за адну лекцыю трэба было плаціць ад 3 да 5 злотых.

У канцэрце прымалі ўдзел студэнты: Хмельнік, 15-гадовы Рычард Бакст і 14-гадовая Пінес.

Ю. Лава.



Вучаніца 5 класа, дочка брыгадзіра калгаса імені Сталіна, Скідэльскага раёна, Беластоцкай вобласці, Вера **Грыгус** чытае таварышам кнігу.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка Белта.

Год таму назад

(Хроніка падзей)

4-га кастрычніка. Прайшло 12 дзён з дня вызвалення горада Беластока ад іга капіталістаў і памешчыкаў. За кароткі тэрмін працоўныя масы пераканаліся, што толькі савецкая ўлада з'яўляецца адзінай уладай, якая клапоціцца аб народзе. Паўсюды відаць расткі новага. Настаў час, калі народ павінен быў сказаць сваё слова:—якая ўлада павінна быць у вызваленых абласцях.

Беласток як адзін з пралетарскіх цэнтраў вызваленых абласцей праяўляе сваю ініцыятыву. 4 кастрычніка на пасяджэнні Часовага ўпраўлення было рашана звярнуцца да ўсіх Часовых упраўленняў гарадоў са зваротам аб скліканні Народнага Сабрання для вырашэння гістарычнага пытання аб уладзе ў Заходняй Беларусі.

5 кастрычніка быў надрукаван гістарычны зварот у мясцовым друку і перадан усім астатнім гарадам заходніх абласцей.

— Народнае Сабранне, — гаворыцца ў звароце, — павінна складацца з дэпутатаў, якіх выбярэ і акажа ім вялікае давер'е сам народ. Гэта Народнае Сабранне павінна вызначыць характар будучай улады, павінна рашыць пытанне аб уваходжанні абласцей Заходняй Беларусі ў састаў БССР і тым самым у састаў СССР. Тады ніч'я захопніцкая рука ніколі не пасмее пасягнуць на нашую мірную працу.

У звароце высоўваюцца асноўныя пытанні, якія павінна будзе вырашыць Народнае Сабранне, лозунгі, пад якімі народ пойдзе на выбары сваіх дэпутатаў.

—Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Заходняй Беларусі, — гаворыцца ў звароце, — пойдуць пад лозунгамі ўстанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі савецкай улады, як улады сапраўды народнай; пад лозунгам уваходжання Заходняй Беларусі ў састаў БССР; пад лозунгам адабрэння канфіскацыі памешчыцкіх зямель у карысць сялян; пад лозунгам патрабавання нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

Палітычныя ўстаноўкі, высунутыя ў гэтым звароце, выклікалі небывалы ўздым на фабрыках, заводах і ў вёсках. Паўсюды адбыліся многалюдныя сходы і мітынгі. Усе Часовыя ўпраўленні гарадоў заходніх абласцей Беларусі падтрымалі заклік Часовага ўпраўлення Беластока. Пачалася падрыхтоўка да гістарычнага Народнага Сабрання.

Цікавыя лічбы

Польскія ўлады зусім не ўдзялялі ніякай увагі выпуску газет і літаратуры. Характэрна прывесці такі факт: на ўсёй тэрыторыі былой Заходняй Беларусі, за выключэннем гарадоў Беластока і Вільна, газеты раней зусім не выходзілі. Тыя газеты, якія выдаваліся, мелі яўна буржуазна-нацыяналістычны характар, ставілі перад сабой задачу адурманьваць масы.

Адразу-ж, з першых дзён арганізацыі савецкай улады ў заходніх абласцях, былі створаны 32 газеты пры часовых упраўленнях. Зараз выходзяць 27 раённых і 5 абласных газет з тыражом 76.000 экземпляраў.

Штодзённа рабочыя, служачыя, калгаснікі і працоўнае сялянства заходніх абласцей атрымліваюць 44.000 экземпляраў газеты «Правда», 27000—газеты «Известия», 14.000 — газеты «Комсомольская правда», 29.000 — газеты «Звязда», 32.000 — газеты «Советская Белоруссия», 6.020 — газеты «Акцябр», 10.000 — газеты «Сталинская молодежь», 11.200 — газеты «Чырвоная змена» і 19.000 — газеты «Піонер Беларусі».

Вялікая колькасць насельніцтва з'яўляецца падпісчыкамі розных журналаў. Толькі адны падпісчыкі журнала «Большэвік» (не ўключаючы продажу ў розніцу) атрымліваюць 9.892 экземпляры. Журнал «В помощь марксистско-ленинскому образованию» атрымліваюць 6.309 падпісчыкаў, «Партийное строительство»—7.500, «Крестьянка» — 3.600, «Крокодил» — 3.700, «Работница»—5.450, «Огонек»—3.800, «Большэвік Беларусі»—3.000, «Іскры Ільіча» — 5.000, «Работніца і калгасніца Беларусі»—2.500, «Советская школа» — 6.050 падпісчыкаў.

У заходніх абласцях БССР налічваецца 1.911 грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку, якія праводзяць вялікую палітыка - выхаваўчую работу. Так, к прыкладу, грамадскі распаўсюджвальнік друку селянін Дуніловіцкага раёна Вілейскай вобласці тав. Харко арганізаваў у пятнаццаці вёсках гэтага раёна падворны абход і правёў індывідуальную падпіску на розныя газеты і журналы больш чым на 1.000 рублёў. Таксама актыўна працуюць па распаўсюджванню газет сяляне вёсак Засеці і Сарачыны тт. Глубокі і Філіповіч. Яны работу арганізавалі так, што ў кожнай сялянскай хаце іх вёсак выпісваецца газета.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

УБ—58. Друкарня Беластокдрук